УДК 808.26 (07.07)

# Падбор матэрыялаў і сістэма практыкаванняў пры вывучэнні жанраў навуковай літаратуры

Мішанькіна А.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Кожны з жанраў навуковай прозы побач з агульнымі стылёвымі рысамі мае і свае індывідуальныя асаблівасці. Напрыклад, у рэфераце матэрыял падаецца, як ў любым жанры навуковай і тэхнічнай літаратуры, фармальна-лагічным спосабам, але ў ім няма той навуковай грунтоўнасці выкладу, якая характэрна для навуковага артыкула. Асабліва падобныя такія жанры, як рэцэнзія, анатацыя, таму найперш трэба ўсвядоміць, у чым сутнасць згаданых жанраў.

Так, у рэцэнзіі аўтар імкнецца даць аб'ектыўную ацэнку навуковай працы, будуе сістэму доказаў, абапіраецца на пераканаўчыя факты, што дазваляе зрабіць пэўныя вывады і заключэнні.

У анатацыі, як і ў рэцэнзіі, аб'ектыўнасць таксама не парушаецца, але не для таго, каб даказаць і пераканаць чытача. Сутнасць і назначэнне анатацыі заключаецца ў тым, што яна дае сціслую характарыстыку самой крыніцы інфармацыі і адказвае на пытанне, аб чым гаворыцца ў першасным дакуменце (першасныя дакумены – гэта рознага роду публікацыі, першакрыніца, арыгінал).

Спецыфічная жанравая асаблівасць водгуку заключаецца ў тым, што аўтар дзеліцца сваімі ўражаннямі аб навуковай працы, пры гэтым не ставіць перад сабой мэты ўсебакова ахарактарызаваць змест і навуковую структуру. Аўтар можа абмежавацца толькі тым, што яго найбольш ўсхвалявала, таму яго разважанні павінны быць пераканаўчымі.

Можна скарыстаць узоры водгуку і рэцэнзіі і выканаць наступныя заданні:

1. Прааналізуйце логіка-сэнсавы і кампазіцыйны падзел тэкстаў.

2. Адзначце ў тэкстах стандартныя моўныя выразы, прааналізуйце іх з сэнсавага і структурнага пункту гледжаннасці ўжытых моўных сродкаў.

3. Выпішыце з тэксту кожнай кампазіцыйнай часткі моўныя стандартныя выразы і дапоўніце гэты спіс іншымі вядомымі вам стандартамі –клішэ, якія адпавядаюць нормам навуковага стылю мовы.

4. Напішыце водгук на выбраную вамі працу (артыкул, раздзел падручніка і інш.) па спецыяльнасці.

Да тэксту анатацыі прад'яўляецца шэраг патрабаванняў: улік прызначэння анатацыі, улік зместу арыгінала, абмежаваны аб'ём, выкарыстанне моўных сродкаў, уласцівых навукова-тэхнічнай літаратуры.

Для выпрацоўкі навыкаў і ўменняў анатавання неабходна правядзенне падрыхтоўчых і маўленчых практыкаванняў.

Падрыхтоўчыя практыкаванні могуць быць такімі:

1. Абагульненне элементаў тэксту: звесткі пра абзацы; звесткі пра табліцы, схемы; падсумоўванне ўсёй інфармацыі.
2. Моўныя практыкаванні: запіс сказаў тэксту, якія нясуць галоўную інфармацыю; перадача галоўных думак іншымі моўнымі сродкамі; выбар інфармацыі.
3. Маўленчыя практыкаванні: сэнсавы аналіз частак тэксту з мэтай вызначэння найбольш важнай інфармацыі і падсумоўванне яе; моўная апрацоўка і выказванне інфармацыі ў выглядзе характарыстыкі, даведкі па плану: выхадныя даныя, асноўныя палажэнні, асноўная праблема, дадатковыя звесткі, пісьмовая анатацыя.
4. Схема анатацыі: прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара; назва твора; месца выдання, выдавецтва, год; кароткі змест (пералік асноўных палажэнняў тэксту крыніцы, можна па главах); выкарыстанне ў тэксце літаратуры; чытацкае назначэнне.
5. Лексічныя сродкі для напісання анатацыі: структура тэксту, кампазіцыя, агульная характарыстыка зместу, спасылка на аўтарскае выказванне, праблематыка, паказ асобных палажэнняў,заключэнне, значэнне.

Рэфераты падзяляюцца на інфарматыўныя (рэферат-канспект) і індыкатыўныя (указальны, апісальны). У аснову класіфікацыі пакладзена ступень аналітыка- сінтэтычнай перапрацоўкі крыніцы.

Інфарматыўныя рэфераты ўключаюць у сябе выклад у абагульненым выглядзе ўсіх асноўных праблем першакрыніцы,

іх аргументацыю, методыку даследвання, асноўныя вынікі і вывады, якія маюць навуковую і практычную каштоўнасць, неабходныя звесткі аб выкарыстанні абсталявання і сферы прымянення. Звычайна ўказваецца прадмет і мэта даследвання.

Інфарматыўны рэферат утрымлівае вялікую фатаграфічную інфармацыю і з'яўляецца добрым даведачным выданнем. Аднак ён патрабуе ад складальніка спецыяльных ведаў.

Індыкатыўныя рэфераты ўказваюць на асноўныя моманты зместу першакрыніцы. У іх выкладаюцца толькі звязаныя з тэмай рэферыраванага дакумента асноўныя палажэнні. Аналіз тэкстаў першаснага дакумента тут рэалізуецца ў асноўным назвай раздзелаў, глаў, параграфаў і да г.п. А гэта зручна для хуткага яго складання з дапамогай фармалізаванай мовы.

Кампазіцыйна тэкст рэферата складаецца з трох частак: уступу (уводнай часткі), асноўнай часткі (апісання) і заключэння. Ва ўступе, як правіла, прыводзяцца кароткія звесткі аб аўтары, даецца агульная характарыстыка крыніцы. У асноўнай частцы (апісанні) прыводзяцца ўсе істотныя палажэнні, асноўныя звесткі, што ўтрымлівае першасны дакумент. У заключэнні прыводзяцца вывады аўтара першаснага дакумента, абагульненні, рэзюмэ.

Работа, якая папярэджвае складанне рэферата: агульнае азнаямленне з тэкстам з мэтай вызначэння тэматыкі і яе актуальнасці; аналіз зместу тэксту; абагульненне выбранай інфармацыі; моўная апрацоўка інфармацыі.

Такім чынам, распрацоўваючы сістэму практыкаванняў пры вывучэнні жанраў навуковай літаратуры, выкладчык вырашае адначасова дзве задачы.

Першая – развіццё навыкаў па характарыстыцы тэкстаў розных жанраў навуковай літаратуры і свядомага карыстання моўным матэрыялам адэкватна стылю. Другая – выпрацоўка ўменняў кампрэсіі і разгортвання навуковай інфармацыі, анатавання і рэферыравання.